Аўтар: Рэдакцыя
14.07.2013 01:00

“Святы пустэльнік”
Апрац. Іаанна Юрошэк
14.06.2013

Да яго гроба кожны год пілігрымуюць 4 мільёны пілігрымаў розных веравызнанняў, просячы ці дзякуючы за дар аздараўлення. Да сённяшняга дня зарэгістравана 23 тысячы аздараўленняў. Юзаф Антоні Маклуф нарадзіўся 8 мая 1828 г. у Бекаан-Кафра ў паўночным Ліване. Ужо ў дзіцячым узросце ён адрозніваўся глыбокай марыйнай пабожнасцю. У гроце, недалёка ад свайго дома, ён ставіў абразік Маці Божай і запальваў перад ім кадзіла. Калі яму было 23 гады, ён адкрыў у сэрцы пакліканне да манаства. Нягледзячы на тое, што ён паходзіў з веруючай сям’і, яго блізкія не ўзрадаваліся яго выбару. “Калі ты хочаш быць манахам, ты павінен стаць святым! Калі ты не збіраешся станавіцца святым, не хадзі нікуды!” – казала яму маці. “Я стану святым”, – паабяцаў ёй тады Юзаф. Сёння мы ведаем, што ён стрымаў слова. †

“Выкрадзены місіянер быў знойдзены”
Малгажата Гаёс
03.07.2013

К аталіцкі місіянер, выкрадзены атрадам Арміі нацыянальнага вызвалення (ELN) у мясцовасці Абрэга ў Калумбіі, быў вызвалены спецыяльнымі сіламі паліцыі. Аперацыя была здзейснена ў дэпартаменце Норт-дэ-Сантандэр каля мяжы з Венесуэлай. Са слоў паліцыі, выкрадальнікі-партызаны, якіх, праўдападобна, прыблізна 20 чалавек, запатрабавалі ад родных місіянера выкуп у 100 млн даляраў. Ад моманту выкрадання (24 чэрвеня) 56-гадовы місіянер Эдгар Занабрыа Сааведра быў скаваны ланцугамі і схаваны ў яме, прыкрытай руном. У момант вызвалення быў абязвожаны, але яго агульны стан здароўя ўрачы акрэслілі як задавальняючы. На жаль, ні адзін з выкрадальнікаў не быў схоплены. Пасля ўступлення паліцыі ім удалося ўцячы.

Аўтар: Рэдакцыя
14.07.2013 01:00

